# ДА ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАРУСІ

**ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!**

**Рабочыя і работніцы, сяляне і сялянкі, работнікі інтэлігентнай працы, мужныя партызаны і партызанкі!**

У дзень 1 Мая — дзень агляду баявых сіл працоўных—Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, Совет Народных Камісараў і Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР шлюць вам баявое гарачае большэвіцкае прывітанне.

**Таварышы!**

1-е Мая 1943 года народы Совецкага Саюза праводзяць у абстаноўцы найвялікшай у гісторыі бітвы з цёмнымі сіламі фашызма. У гэтай бітве вырашаецца лёс совецкай дзяржавы і нашага народа. На полі бітвы вырашаецца пытанне аб жыцці і смерці нашага народа, аб тым, быць нашаму народу свабодным, ці быць фізічна знішчаным, гвалтоўна анямечаным, ператвораным у рабоў нямецкіх памешчыкаў і баронаў.

Смерць у вобразе Гітлера брыдзе па калені ў крыві. Страшэннае зарава пажару пылаючых гарадоў і сёл стаіць над нашай роднай зямлёй. На месцы цудоўных гарадоў Беларусі, паселішчаў чарнеюць страшныя папялішчы. На плошчах стаяць шыбеніцы — сімвал дзікунства і лютасці гітлераўскіх банд. Забойствы, грабяжы, расстрэлы, угон у рабства—усё выкарыстоўваецца катамі Гітлера для масавага знішчэння нашых людзей. Выналодзяцца новыя такаранні. Гітлераўцы нашым дзецям мажуць губы спецыяльнай атрутай, каб яны паміралі. Нашых матак, сёстраў, дзяцей немцы прымушаюць аддаваць сваю кроў для раненых нямецкіх салдат і афіцэраў. Наша родная Беларусь пакрыта сотнямі канцлагераў, адкуль вывозяць горы трупаў нашых братоў, якія паміраюць ад голаду, холаду, хвароб і катаванняў. Ад Беластока да Магілёва, ад Палесся да Віцебска звер з гітлераўскай свастыкай сее смерць і разбурэнне на нашай зямлі.

Чырвоная Армія ў перыяд зімовага наступлення вызваліла ад нямецкіх захопнікаў тэрыторыю ў 480.000 квадратных кілометраў. Яна ўзняла родны совецкі сцяг над тысячамі гарадоў, сёл і вёсак. Яна знішчыла за гэту зіму на совецка-германскім фронце 850.000 салдат і афіцэраў. Звыш 300 тысяч гітлераўцаў захоплена ў палон. Гітлераўцы страцілі за гэты перыяд больш 20 тысяч гармат, каля 10 тысяч танкаў і звыш 5 тысяч самалётаў.

Байцы і камандзіры Чырвонай Арміі загартаваліся ў жорсткіх баях, навучыліся біць і гнаць немцаў. Чырвоная Армія надламала магутнасць германскай ваеннай машыны, прасунулася далёка наперад. Лінія фронта блізка падышла да Беларусі.

Адчуваючы набліжэнне немінучай пагібелі, Гітлер і яго банда кідаюцца на крайнія меры. Гітлер аб'явіў татальную мабілізацыю. Ён падчышчае ўсе рэшткі свайго насельніцтва. На фронт гоняць падросткаў і старыкоў. Па шляхах Беларусі ў фашысцкую Германію ўганяюць нашу моладзь і жанчын у рабства. Гітлер усімі сродкамі, вераломствам, правакацыяй, атрутай хлусні і ашуканствам спрабуе ажыццявіць свае каварныя замыслы. Каб запоўніць велізарныя прабоіны ў сваіх радах, ён кінуўся на нечуваную правакацыю: аб'явіў мабілізацыю і гвалтоўна забірае беларускіх юнакоў і мужчын у германскую армію. Робіцца гэта пад выглядам стварэння так званай рускай і беларускай нацыянальнай арміі. Шляхам ашуканства, правакацыі, прымусу і пад страхам смерці заганяюць у гэтыя арміі некаторых ваеннапалонных і мабілізаваных.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі

**Сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.**

**Старшыня Совета Народных Камісараў Беларускай ССР І. БЫЛІНСКІ.**

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.**